ЗАЦВЯРДЖАЮ

Старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры

________ А.А.Сабірава
_________________21.04.2016

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дырэктар ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна”

________ Т.М.Адамян
_________________21.04.2016

# П А Л А Ж Э Н Н Е

аб правядзенні абласнога конкурсу відэаролікаў “Чытаем Багдановіча разам”, прысвечанага 125-годдзю з дня нараджэння беларускага паэта Максіма Багдановіча і прымеркаванага да Года культуры ў Рэспубліцы Беларусь

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1 Дадзенае Палажэнне вызначае парадак і ўмовы правядзення абласнога конкурсу відэаролікаў “Чытаем Багдановіча разам” (далей – Конкурс).

1.2 Конкурс праводзіцца ў рамках мерапрыемстваў, прысвечаных Году культуры ў Рэспубліцы Беларусь.

1.3 Заснавальнікамі і арганізатарамі Конкурсу з’яўляюцца ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна”, Віцебская абласная арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў культуры.

## 2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

2.1 Галоўнай мэтай Конкурсу з’яўляецца папулярызацыя творчасці класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча.

2.2 Асноўнымі задачамі Конкурсу з’яўляюцца:

– выяўленне, падтрымка, стымуляванне інавацыйнай творчай дзейнасці супрацоўнікаў бібліятэк;
– удасканаленне форм і метадаў работы бібліятэк па папулярызацыі твораў беларускай літаратуры;
– пашырэнне выкарыстання беларускай мовы ў сацыякультурнай дзейнасці бібліятэк.

## 3. АРГАНІЗАЦЫЯ І ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

3.1 Конкурс праводзіцца з 1 мая па 1 лістапада 2016 года. Да ўдзелу ў Конкурсе запрашаюцца супрацоўнікі ДУ “Віцебская абласная

бібліятэка імя У.І. Леніна”, публічных бібліятэк сеткі Міністэрства культуры Віцебскай вобласці, члены прафсаюза работнікаў культуры.

3.2 Для арганізацыі і падвядзення вынікаў Конкурсу ствараюцца аргкамітэт і журы (Дадатак 1).

3.3 Прыём конкурсных работ ажыццяўляецца з 1 па 10 лістапада 2016 г. Матэрыялы прадастаўляюцца ўдзельнікамі ў аддзел бібліятэказнаўства на любым з’ёмным носьбіце (флэш-карта, DVD-дыск, CD-дыск).

3.4 Інфармацыя аб правядзенні конкурсу і яго афіцыйныя вынікі будуць размешчаны на сайце ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна”.

## 4. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА РАБОТ

4.1 Да ўдзелу ў Конкурсе прымаюцца відэаролікі, створаныя з дапамогай камеры, мабільнага тэлефона, планшэта і інш., па тэме, якая адпавядае ўмовам конкурсу. Матэрыялы прадастаўляюцца па намінацыях:

– **“І прад высокаю красою…”** (відэазапіс выканання паэтычных твораў);
– **“Спрадвечнае”** (відэазапіс выканання твораў мастацкай прозы, перакладаў і інш.);
– **“У «Вянок» паэту”** (відэазапіс твораў уласнага сачынення, прысвечаных М. Багдановічу, у выкананні аўтараў).

4.2 Сюжэты могуць уключаць інсцэніроўкі, быць папярэдне зманціраваны і адрэдагаваны па жаданні ўдзельніка Конкурсу з выкарыстаннем мелодый, тытраў і г.д.

4.3 Хранаметраж работ не павінен перавышаць 5 хвілін.

4.4 Работы, прадастаўленыя на Конкурс, павінны быць запісаны ў фармаце mpeg4, FLV, 3GP, WMV, памер 640x480, 720x480 і вышэй (CamRip, TS).

4.5 Да кожнай работы дадаецца заяўка на ўдзел у Конкурсе (прадастаўляецца ў вольнай форме з указаннем абранай намінацыі, імя і прозвішча ўдзельніка, яго месца работы і пасада).

4.6 Відэаролікі, якія маюць пашкоджанні ў выяўленчым матэрыяле або гуку, да ўдзелу ў конкурсе не дапускаюцца.

## 5. КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ

5.1 Ацэнку работ ажыццяўляе журы конкурсу.

5.2 Журы ацэньвае работы па дзесяцібальнай шкале і вызначае пераможцаў Конкурсу па наступных крытэрыях:

– арыгінальнасць зместу і формы работы;
– тэхнічная складанасць выканання работы;

– творчы падыход да стварэння відэароліка;
– эмацыйнае ўздзеянне.

## 6. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ

6.1 Вынікі конкурсу будуць абвешчаны падчас правядзення літаратурна-музычнай вечарыны “Зорка Венера ўзышла над зямлёю…” (снежань 2016, агульная чытальная зала абласной бібліятэкі).

6.2 Вынікі ацэнкі работ удзельнікаў вызначаюцца па зводных выніках колькасці балаў, прысвоеных кожным членам журы работам удзельнікаў.

6.3 Па колькасці набраных балаў вызначаюцца пераможцы Конкурсу, якія займаюць I, II і III месца.

6.4 Віцебская абласная арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў культуры забяспечвае набыццё падарункаў для ўзнагароджвання пераможцаў.

6.5 Журы конкурсу і аргкамітэт можа ініцыіраваць ўвядзенне дадатковых прызавых месцаў для ўзнагароджання і заахвочвання ўдзельнікаў.

6.6 Рашэнне журы з’яўляецца абавязковым і перагляду не падлягае.

Дадатак 1

**СКЛАД ЖУРЫ**
абласнога конкурсу відэаролікаў “Чытаем Багдановіча разам”

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Адамян Т.М. | дырэктар ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна”, старшыня журы |
| 2 | Пугачова Н.А. | загадчык аддзела бібліятэказнаўства ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна”, сакратар журы |

**Члены журы**:

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Сабірава А.А. | старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры |
| 2 | Камендантава В.М. | намеснік дырэктара ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна” |
| 3 | Крыклівец А.У. | дацэнт кафедры літаратуры Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Расіі, лаўрэат шматлікіх міжнародных літаратурных конкурсаў |
| 4 | Баярынцаў І.В. | рэжысёр, член Беларускага саюза тэатральных дзеячаў, выкладчык Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў |
| 5 | Шпакоўская Г.І. | вядучы карэспандэнт абласной газеты “Витебские вести” |
| 6 | Рагачова Л.І. | загадык аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна” |
| 7 | Фенчанка Н.В. | вядучы бібліятэкар інфармацйна-бібліяграфічнага аддзела ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна |

# АРГКАМІТЭТ

абласнога конкурсу відэаролікаў “Чытаем Багдановіча разам”

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Пугачова Н.А. | загадчык аддзела бібліятэказнаўства ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна”, старшыня аргкамітэту |
| 2 | Васілеўская А.М. | галоўны бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна” |
| 3 | Балабух Т.А. | вядучы бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна” |
| 4 | Капліна Г.А. | бібліятэкар I катэгорыі аддзела бібліятэказнаўства ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна” |
| 5 | Наваранка І.М. | загадчык аддзела “Агульная чытальная зала” ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна” |
| 6 | Юпатава А.В. | інжынер-праграміст аддзела аўтаматызацыі ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна” |

**Адрас Аргкамітэта**

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
Аддзел бібліятэказнаўства
Тэл. (0212) 37 31 01
E-mail: metodic@vlib.by